Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

29 КРАСАВІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 83 (29705)

«КАНЁК-ГАРБУНОК»: НОВАЕ ПРАЧЫТАННЕ 5

ПЕРШАМАЙ: КАШТОЎНАСЦЬ СВЯТА 13

ЛІЧБА ДНЯ

Больш як 95 працэнтаў

ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, атрымала матэрыяльную дапамогу да Дня Перамогі, паведаміла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Выплаты матэрыяльнай дапамогі пачаліся 25 красавіка і пройдуць да 6 мая ўключна. Яе памеры складаюць ад Br750 да Br1800. Атрымальнікамі дапамогі на агульную суму 11 млн рублёў стане каля 12 тысяч чалавек. Адначасова з атрыманнем матэрыяльнай дапамогі ва ўсіх раёнах краіны пройдуць урачыстыя ўшанаванні ветэранаў ВАВ, у тым ліку тых, якія пражываюць у стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання, з уручэннем памятных паштовак, падарункаў, кветак і сувеніраў.

Лагойска-маладзечанская будоўля



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кожны год у Лагойску ўзводзяцца шматкватэрныя дамы. Вось і цяпер на Мінскай вуліцы райцэнтра будуюцца два новыя шматпавярховікі.

Гэтым разам па заказе Лагойскага УКБ будоўлю вядуць маладзечанцы, а дакладней спецыялісты будаўнічага ўпраўлення № 202 з Маладзечна.

Узровень

ПАДЗЯКА ЗА СТВАРАЛЬНУЮ ПРАЦУ і ўнёсак у развіццё краіны

У Мінску адкрылася абноўленая Дошка гонару

Напярэдадні свята працы абноўленая Дошка гонару адкрылася ў Мінску на плошчы Дзяржаўнага сцяга. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, міністэрстваў, кіраўнікі прадпрыемстваў-пераможцаў і іх калектывы. На дошку занесены 64 пераможцы ў розных намінацыях. СТАР. 3

Камунальныя стасункі

ЖКГ-СТРЫМЫ І АНЛАЙН-КАНСУЛЬТАЦЫІ

Камунальнікі прапануюць жыхарам новыя інтэрнэт-стасункі

Дзяржаўную інфармацыйную сістэму ЖКГ камунальнікі з часам плануюць інтэграваць са службай 115. А акрамя стандартных стасункаў — сустрэч, сходаў, аб'яў на дошках каля пад'ездаў і іншых форм работы з жыхарамі, — будуць актыўна развіваць новыя спосабы камунікацыі з насельніцтвам, каб ісці ў нагу з часам, сцвярджаюць спецыялісты галіны. Пры гэтым, вядома, працягнецца і звыклая работа па мадэрнізацыі і добраўпарадкаванні дамоў і двароў беларусаў.

ДАМЫ, ДВАРЫ, ПАД'ЕЗДЫ...

Летась у Мінску капітальна адрамантавана 222 дамы, сёлета запланавана яшчэ 218. З мінулага года дамы ў сталіцы рамантуюцца комплексна, то-бок работы вядуцца не на адным будынку, а адразу на групе дамоў, якія аб'яднаны адной тэрыторыяй, расказаў **Андрэй НОВІК, намеснік генеральнага дырэктара Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.** СТАР. 4

КАРОТКА

- **Натарыусы Беларусі бясплатна пракансультуюць 6 мая.**
- У Гомельскай вобласці на дапамогу ўкраінскім бежанцам накіравана амаль Br800 тысяч.
- **Траціну даследчыкаў НАН складаюць маладыя вучоныя.**
- Напярэдадні Радаўніцы працэдура атрымання пропуску ў пагранічную зону будзе спрошчана.
- **Дзіцячая чыгунка адкрые летні сезон 30 красавіка.**
- ДАІ ў выхадныя будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. Асаблівая ўвага да дарожнага руху ў Радаўніцу.
- **У Гродзенскай вобласці напалову скарацілі колькасць незавершаных будоўляў за 2021 год.**

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ВЫТВОРЧАЯ КААПЕРАЦЫЯ ПАВІННА СТАЦЬ АСНОВАЙ СУПРАЦОЎНІЦТВА З РАСІЙСКІМІ РЭГІЁНАМІ»

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з чарговай дэлегацыяй рэгіёнаў Расіі. Гэтымі днямі з афіцыйным візітам у Мінску быў губернатар Варонежскай вобласці Аляксандр Гусеў.

Вытворчая каапераця павінна стаць ключавым аспектам гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Варонежскай вобласці, адзначыў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з губернатарам гэтага рэгіёна Расіі.

«Мяркую, што ключавым аспектам нашых гандлёва-эканамічных адносін павінна стаць вытворчая каапераця. Мы гэтую тэму вельмі дэталёва абмеркавалі ў ходзе майго нядаўняга візіту ў Прымор'е, а напярэдадні — з Прэзідэнтам Расіі. Як паказвае практыка, менавіта кааперацыйнае супрацоўніцтва закладвае магутны базіс для доўгатэрміновых адносін і дае добры інтэграцыйны эфект. Пры адкрыцці сумесных вытворчасцяў, напрыклад, мы накіраваныя на павелічэнне ступені іх лакалізацыі, што гарантавана забяспечыць стварэнне новых рабочых месцаў у рэгіёне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Прэзідэнта, адной з вядучых тэм сустрэчы з'яўляецца супрацоўніцтва ў будаўнічай сферы. «Як могуць працаваць беларускія будаўнікі, вам добра вядома. Павінен сказаць, што ўсе навучыліся добра працаваць у будаўніцтве. Але па цане і якасці беларусам, веравогна, роўных няма. Я апошнім часам заўважаю, што і культура будаўніцтва на адпаведным узроўні», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён акцэнтаваў, што ў згаданай галіне неабходна прывыкаць да парадку, бо канкурэнцыі на расійскім рынку не вытрымаем — павінны быць найвышэйшая культура, нізкі сабекошт, калі беларусы хочуць эфектыўна там працаваць.

Па словах кіраўніка дзяржавы, без падтрымкі заходніх інвестараў, сэканоміўшы сродкі, Беларусі ўдалося захаваць буйныя вытворчасці і сёння выпускаць аўтобусы, якія карыстаюцца попытам на расійскім рынку. Узнікла неабходнасць і ў аўтамабілях МАЗ. Велізарны попыт у Расіі на беларускія БелАЗы.

«На некаторыя віды аўтамабіляў, станкабудавання ёсць велізарны попыт. Калі маецца попыт на наш трактар, дык неабходна іншыя прадпрыемствы, якія менш задзейнічаны, падключаць да выпуску імпартазамяшчэння і гэтак далей. Хоць у нас не стаіць так жорстка пытанне па імпартазамяшчэнні, як у Расіі», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што з Расіяй беларусы сёння гатовы супрацоўнічаць па любых пытаннях. Добрыя магчымасці ў прамысловасці, па яго словах, Беларусі дасталіся ў спадчыну пасля распаду СССР. «Велізарныя магчымасці, бо мы толькі палову спажываем ад таго, што ствараем. Ды і яшчэ не ўсе магутнасці задзейнічалі. Так было ў савецкія часы, калі мы тут, маючы высокі тэхналагічны ўзровень, добрыя кадры, стварылі такую базу», — сцвярджае кіраўнік дзяржавы.

Паказальны тут прыклад БелАЗа. Прэзідэнт акцэнтаваў, што ў Беларусі гэтыя гіганты амаль не выкарыстоўваюцца — ідуць на экспарт. А калісьці прадпрыемства прапаноўвалі ўвогуле закрыць.

«30 працэнтаў сусветнага рынку сёння займае БелАЗ. Расія, Казахстан, Узбекістан просяць, каб мы ім паставілі БелАЗы. Аказаліся запатрабаванымі. Узровень таго, што было тады створана, мы падтрымлівалі. Мы і прапануем, бо ўсё самі спажыць не можам, а скарачаць вытворчасць нельга — гэта ж рабочыя месцы, людзі ды высокатэхналагічная вытворчасць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прапанаваў беларускі лідар выкарыстоўваць нашы магчымасці па мадэрнізацыі транспартнай інфраструктуры ў Расіі. Беларускія вытворцы раяць комплексны падыход да рамонту дарог, мастоў, пуцеправодаў.

«Мы гэта ўмеем рабіць. Больш за тое, мы сёння вельмі мадэрнізуемся ў гэтай інфраструктурнай частцы ў Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Мы гатовыя, паводле кіраўніка дзяржавы, забяспечыць і пастаўкі пасажырскай, камунальнай і сельскагаспадарчай тэхнікі. Акрамя простых паставак харчавання, беларусы могуць падзяліцца і тэхналогіямі ў названым кірунку.

«Мы рэалізоўваем трэцюю пяцігодку адраджэння вёскі, і не толькі прамысловага сектара, але і сацыяльнай сферы. Ведаеце пра нашы аграгарадкі. Калі інтарэс ёсць, мы можам паказаць. Паглядзелі мы і ў вас на перспектывы буйных аграхолдынгаў. Спрабуем і ў сябе некалькі стварыць. Пакуль даюць вельмі добры вынік. Мы акуратна ў гэтым кірунку рухаемся. Калі будзе неабходна, — насенняводства, жывёлагадоўля, племянная справа,— мы гатовыя не проста паказаць і расказаць, але і дапамагчы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прапануе ён і цікавыя беларускія напрацоўкі ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, уключаючы пытанні водаачысткі і водаспажывання.

У завяршэнне сустрэчы Прэзідэнт падзякаваў усім губернатарам Расіі, бо пры іх садзейнічанні краіны маюць партнёрскае ўзаемадзеянне і імкнуцца выбудаваць адзіную Саюзную дзяржаву на новых прынцыпах, каб ніхто з удзельнікаў не быў пакрыўджаны.

«Да такога саюза, упэўнены, будуць падключацца і іншыя рэспублікі былога Савецкага Саюза», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

❍ Каментарый у тэму

Губернатар Варонежскай вобласці Аляксандр ГУСЕЎ расказаў журналістам, якія напрацоўкі беларускіх спецыялістаў яго асабліва зацікавілі і ў якія сумесныя праекты гэта можа ўвасобіцца.

Асабліва важным праектам, па яго словах, стане набыццё медыцынскага абсталявання для лячэння раку. «Мы будуем вялікі хірургічны корпус для лячэння анкахворых. У нас там будзе больш за 300 ложкаў. Цяпер ідзе фаза камплектацыі абсталявання для гэтага праекта. Мы ўчора змаглі азнаёміцца з элементамі абсталявання, якое ствараецца на тэрыторыі Беларусі. Гэта датычыцца камплектацыі і хірургічных, і тэрапеўтычных аддзяленняў. Там і стойкі хірургічныя, і ложкі спецыялізаваныя ў палаты. Такі вялікі набор абсталявання. У тым ліку пазнаёміліся з абсталяваннем цяжкага класа. Нашы калегі на працягу аднаго-двух тыдняў прыедуць сюды, яшчэ раз усё паглядзяць», — распавёў Аляксандр Гусеў.

Ён пахваліў напрацоўкі Беларусі ў арганізацыі радыетэрапеўтычнага комплексу ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі і адзначыў, што варонежскія спецыялісты пазнаёмяцца і з такім вопытам.

Асобная сфера ўзаемадзеяння — жывёлагадоўля. Тут губернатар кажа пра набыццё даільнага абсталявання і сельскагаспадарчай тэхнікі ў Беларусі.

Не абышоў губернатар і тэму будаўнічых праектаў. Так, у прыгарадзе Варонежа беларусы пабудавалі «пад ключ» школу на 500 вучняў. Паглядзеўшы на вынікі, улады Варонежа запрасілі нашых спецыялістаў будаваць яшчэ некалькі аб'ектаў — футбольны стадыён, дзве школы, адна з якіх на 3000 вучняў.

«Гэта добры прыклад таго, як неабходна выбудоўваць узаемаадносіны. Беларускі бок — гэта не проста генпадрадчык, які наняў нашых варонежскіх субпадрадчыкаў. Гэта беларускія інжынеры, будаўнікі, шмат будаўнічых матэрыялаў і абсталявання вучэбнага, тэхналагічнага з Беларусі. Мы ніякім чынам іх у праектных рашэннях не абмяжоўвалі. Мне здаецца, гэта правільны падыход, які дае магчымасці паказаць узровень узаемадзеяння і матывуе нашых будаўнікоў павышаць свае кампетэнцыі», — падкрэсліў Аляксандр Гусеў.

Блізкая ўлада

Наталля КАЧАНАВА:

«АД ТАГО, ЯК МЫ ПРАЦУЕМ З ЛЮДЗЬМІ, ЗАЛЕЖЫЦЬ СІТУАЦЫЯ Ў КРАІНЕ»

На пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі ў Бялынічах падвялі вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Магілёўскай вобласці.

Удзел у яго рабоце прымалі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, члены Савета Рэспублікі, старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка, памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Мартынюк, старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына Раінчык, кіраўнікі Бялыніцкага і Горацкага выканкамаў, абласных і раённых арганізацый, члены Маладзёжнага парламента і маладзёжных арганізацый.

Магілёўшчына завяршыла спіс рэгіёнаў, дзе сенатары правялі прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях і па традыцыі на наступны пасля гэтага дзень падвялі вынікі маштабнай работы.

— Прэзідэнт заўсёды гаворыць, што наша дзяржава і наша палітыка — гэта перадусім людзі, — падкрэсліла Наталля Качанава, адкрываючы выязное пасяджэнне. — Якія законы ні прымаліся б на рэспубліканскім узроўні — а іх у нас пад тры тысячы, — якія ні падпісваліся б рашэнні, указы Прэзідэнта, на месцах іх рэалізуюць людзі. І ад таго, як мы працуем з імі, залежыць сітуацыя ў краіне. Таму гэта пытанне ніколі не страчвала актуальнасці. Наадварот, яно з кожным годам набывае ўсё большую значнасць. Разумеючы, які сёння ідзе інфармацыйны паток на кожнага чалавека, і вельмі часта гэта лжывыя факты, мы яшчэ раз пераконваемся: наш поспех у тым, што мы працуем з людзьмі.

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што ўсе існуючыя формы і метады — дыялогавыя пляцоўкі, сустрэчы ў працоўных калектывах, грамадскія прыёмныя, асабістыя прыёмы грамадзян — вельмі патрэбныя для таго, каб вырашаць важныя для краіны пытанні.

— У нас існуе выразная схема па арганізацыі работы з грамадзянамі, — адзначыла Наталля Качанава. — Адзінае абурае, што ёсць кіраўнікі, якія не знаходзяць часу для работы з людзьмі. Шостым Усебеларускім народным сходам, Пасланнем Прэзідэнта да парламента і народа выразна абазначаны тыя тэмы, па якіх мы павінны працаваць. І сустрэчы

Фота БелТА.

з людзьмі тут выходзяць на першы план.

Пытанні, з якімі грамадзяне звяртаюцца, датычацца ўсіх сфер жыцця: ЖКГ, адукацыі, аховы здароўя, навядзення парадку на зямлі. І нярэдка гэтыя праблемы становяцца нагодай для распрацоўкі новых законапраектаў, унясення дапаўненняў у існуючыя.

Спікер акцэнтавала ўвагу на тым, што жыццё мяняецца, узнікаюць новыя задачы, якія неабходна вырашаць. Гэта значыць, што трэба прымаць актуальныя рашэнні на дадзеным этапе развіцця нашай краіны, вобласці, горада.

Аб выніках работы са зваротамі грамадзян далажылі прадстаўнікі Савета Рэспублікі, Магілёўскага аблвыканкама. Па выніках работы мінулага года адзначаецца тэндэнцыя па зніжэнні колькасці зваротаў. Сёлета па Магілёўшчыне мінус 17 % ад узроўню мінулага года за аналагічны перыяд.

— Падчас такіх выездаў мы аналізуем, якая работа зроблена на месцах органамі ўлады, — рэзюмавала спікер верхняй палаты парламента. — І зніжэнне колькасці зваротаў — добры вынік. Падчас пашыранага пасяджэння выразна акрэсліліся пытанні для далейшага паглыбленага і аператыўнага абмеркавання. На першы план выйшлі праблемы з транспартным забеспячэннем раёнаў. Трэба правільна выбудаваць графік руху грамадскага транспарту ў кожнай вобласці. Нельга спяшацца нейкія рэйсы скарачаць. Праблема нумар два — садовыя таварыствы. Сёння моладзі нецікава нешта вырошчваць на зямлі, прасцей купіць у краме. Між тым павялічваецца колькасць пустых дачных участкаў. І з гэтым нешта трэба вырашаць.

Наталля Качанава звярнула ўвагу і на тое, што для парламентарыяў падчас асабістых прыёмаў стала традыцыяй цікавіцца ў людзей, ці ўсё іх задавальняе, ці вытрымліваецца цэнавы і асартыментны пералік у крамах, дзе яны абслугоўваюцца. І тое, што народ не выказвае прэтэнзій, яшчэ раз пацвярджае, што работа правадзіцца правільная.

Пасля пасяджэння члены Савета Рэспублікі, кіраўніцтва вобласці і Бялыніцкага раёна наведалі алею Герояў у парку «Ліпавы гай» у Бялынічах.

— Гэта святыя для нас месцы, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Прэзідэнт гаворыць, што ўся Беларусь — жывы помнік той вайне. І мы шануем памяць тых, хто загінуў, а таксама клапоцімся пра тых, хто яшчэ побач з намі і можа расказаць пра жахі Вялікай Айчыннай вайны. Наш абавязак — перадаць наступнаму пакаленню гэтую памяць.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
г. Бялынічы.

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 30 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея Анатолеўна ЛАЗАРЭВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ПАДЗЯКА ЗА СТВАРАЛЬНУЮ ПРАЦУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як адзначыў на ўрачыстай цырымоніі **намеснік міністра эканомікі Сяргей МІЦЯНСКІ**, у 2021 годзе беларуская эканоміка перабудоўвалася, каб захаваць сваю канкурэнтаздольнасць ва ўмовах пандэміі і санкцыйнага ціску.

— Забяспечаны станоўчыя вынікі ў сацыяльна-эканамічным развіцці. Грашовыя даходы насельніцтва ў рэальным выражэнні выраслі на 2 %. У поўным аб'ёме выкананы абавязацельствы дзяржавы па выплаце пенсій і дапамог, сфарміравана рэкорднае дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі. Яно склала 3,8 мільярда долараў. Забяспечаны тэмп росту ВУП у памеры 2,3 %. Асноўны станоўчы ўклад унеслі такія галіны, як прамысловасць, інфармацыя і сувязь, транспарт. Па выніках 2021 года пераможцамі, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця, сталі 64 намінанты. Кожны з сямі рэгіёнаў прыклаў намаганні, каб забяспечыць рост якасці і ўзроўню жыцця насельніцтва, — адзначыў намеснік міністра.

Пераможцамі сталі Гродзенская і Мінская вобласці, горад Мінск. У Гродзенскай вобласці ВУП склаў 105 %.

— З аднаго боку, год быў няпросты, мы адчувалі санкцыйны ціск, ковідныя абмежаванні, разам з тым Гродзенская вобласць па экспарце прырасла на 40 %. Вобласць самая малая па плошчы, пры гэтым яна забяспечвае 17 % валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі. Гэта заслугі нашых жыхароў, якім хачу падзякаваць за стваральную працу і ўклад у развіццё нашай краіны, — сказаў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь НЯВЕРА**.

Два раёны Мінска, Савецкі і Цэнтральны, сталі пераможцамі сярод раёнаў і раённых гарадоў. Акрамя таго, найлепшымі сярод раёнаў сталі Смаргонскі, Астравецкі, Магілёўскі, Салігорскі і Калінкавіцкі.

— Мы ганарымся поспехамі ўсіх нашых прадпрыемстваў. Пяты год нашы раёны, Цэнтральны і Савецкі, займаюць першыя месцы. 19 прадпрыемстваў з 64 намінантаў — гэта сталічныя пераможцы. Нягледзячы на ўсе перыпетыі, з якімі сутыкнулася наша краіна ў 2021 годзе, мы выконваем паказчыкі, працуем на апярэджванне, атрымліваем добрыя вынікі. Упэўнена, што праз год на гэтай дошцы зноў будзе Мінск і найлепшыя прадпрыемствы сталіцы, — падкрэсліла **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ**.

У 2021 годзе актыўна вялася работа па мадэрнізацыі і стварэнні новых вытворчасцяў, павышэнні якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Уведзена ў эксплуатацыю Петрыкаўскае ўпраўленне ААТ «Беларускалій», якое дазволіць замацаваць пазіцыі краіны на сусветным калійным рынку. ААТ «Белшына» асвоіла выпуск новых мадэляў шын для эксплуатацыі на самазвалах, пагрузчыках і бульдозерах. Актыўна будаваўся электратранспарт. Мінскім аўтазаводам пабудавана 85 электробусаў. У цэлым па краіне выраблена 416 адзінак гарадскога электрычнага пасажырскага транспарту.

Па выніках 2021 года сярод арганізацый прамысловасці найлепшымі прызнаны ААТ «Завод Мінскагрампраммаш», ААТ «Беларускалій» і ААТ «Крыён». Сярод камунальных арганізацый пераможцамі сталі ААТ «Гомельскі бялкова-тлушчавы завод», ААТ «Тураўскі малочны камбінат», УП «Экарэс».

— Наша прадпрыемства было створана ў рамках праграмы па развіцці Прыпяцкага Палесся. Дзякуючы такім праграмам ствараюцца выдатныя заводы. Тураў — гэта ўсяго каля трох тысяч насельніцтва, а на заводзе створана больш за 500 працоўных месцаў. За мінулы год выпушчана амаль 34 тысячы тон сыру, гэта 12 % ад аб'ёму вытворчасці сыроў усёй краіны. Прадпрыемства экспартарыентаванае, 80 % нашай прадукцыі ідзе на экспарт. І ў такіх дальніх краінах, як Японія, Арабскія Эміраты, і ў нашых суседзяў-расіян людзі маюць магчымасць атрымліваць асалоду ад беларускіх сыроў, створаных па італьянскай тэхналогіі. Я ўдзячная нашаму ўраду, Прэзідэнту за магчымасць развіцця інвестыцыйнага праекта, акцыянерам — за цярпенне і дапамогу, а таксама нашаму калектыву — за высокі прафесіяналізм і самаддачу, — адзначыла **дырэктар Тураўскага малочнага камбіната Вольга ЛУЦКО**.

Алена КРАВЕЦ.

МЫ ПАВІННЫ СПАДЗЯВАЦЦА ТОЛЬКІ НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ І АДНАДУМЦАЎ

Нацыянальны форум атлетаў прайшоў у Мінску

Самыя актуальныя пытанні для беларускага і расійскага спорту абмеркавалі ўдзельнікі II Нацыянальнага форуму атлетаў, які прайшоў у штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі. Форум сабраў больш за 250 чалавек: алімпійскія чэмпіёны, трэнеры, спартыўныя функцыянеры. Прадстаўнікі спартыўнай грамадскасці абедзвюх краін сустрэліся, каб абмеркаваць многія пытанні, але галоўнае — як далей развівацца ў новых умовах. Ужо неаднаразова падкрэслівалася, што Беларусь і Расія маюць вялікі патэнцыял у спартыўным супрацоўніцтве.

Перад адкрыццём Нацыянальнага форуму атлетаў **прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь Віктар ЛУКАШЭНКА** ўручыў каштоўныя падарункі сярэбраным прызёрам зімовых Алімпійскіх гульняў 2022 года ў Пекіне Антону Смольскаму (біятлон) і Ганне Гуськовай (фрыстайл). Па традыцыі прайшло і памятнае гашэнне канверта з арыгінальнай маркай «Медалісты XXIV зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне». Урачыстую цырымонію правялі прэзідэнт Віктар Лукашэнка, міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган, прызёры Гульняў Антон Смольскі і Ганна Гуськова.

Адкрываючы форум, Віктар Лукашэнка падкрэсліў, што спорт, здаровы лад жыцця сёння не перастаюць заставацца магутнай сілай, якая аб'ядноўвае нацыі, сапраўдным рэсурсам для развіцця краін. Ён падзякаваў гасцям форуму з Расіі за супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне. «Такі адкрыты прафесійны дыялог служыць інтарэсам развіцця спорту, садзейнічае ўмацаванню ўзаемапавагі, даверу, а рэалізацыя прапаноў, якія будуць выпрацаваны на форуме, стане важкім укладам у дасягненне тых маштабных мэт, якія стаяць перад двума алімпійскімі камітэтамі. Хачу запэўніць вас у тым, што мы будзем дзяліцца напрацаваным вопытам правядзення спаборніцтваў, які ўключае ўсю лінейку спартыўных мерапрыемстваў: ад невялікіх турніраў да найбуйнейшых міжнародных першынстваў», — падкрэсліў прэзідэнт НАК Беларусі.

Па яго словах, крызісны час заўсёды дае шанц для дасягнення новых вяршынь, адкрывае для ўсіх нас новыя магчымасці. А рэцэпт поспеху ў крызісныя часы адзін: пакуль астатнія прыходзяць у сябе — дзейнічаць. Толькі так можна сапраўды адаптавацца да змен. «Перабудаваліся, выраўнялі свой псіхалагічны стан — і наперад. Мы ні ў якім разе не павінны паддавацца на правакацыі з розных бакоў, а павінны спадзявацца толькі на цвярозы розум, уласныя сілы і аднадумцаў, — адзначыў прэзідэнт НАК Беларусі.

Кіраўнік Алімпійскага камітэта Расіі Станіслаў ПАЗНЯКОЎ падкрэсліў, што менавіта цяпер, калі міжнародны алімпійскі рух перажывае сур'ёзны крызіс, супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх спартсменаў павінна папулярызаваць адзін з галоўных алімпійскіх прынцыпаў — навядзенне мастоў паміж краінамі. Ён падзякаваў беларускім калегам за магчымасць зноў сустрэцца з аднадумцамі і папрацаваць над далейшымі формамі ўзаемадзеяння.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота НАК Беларусі.

Кантэкст

Параноя па-рыжску

Латвійскія ўлады запалохваюць грамадзян, каб тыя не ездзілі ў Беларусь

Як вядома, улады Беларусі з 15 красавіка на месяц увялі бязвіз на фоне адваротных крокаў прыбалтыйскіх краін. Пасольства Латвіі ў Мінску спыніла выконваць консульскія функцыі «на нявызначаны тэрмін», адзначыў Baltnews. Больш за тое, з 5 красавіка грамадзяне Беларусі могуць прэтэндаваць на візы ў гэтую краіну па абмежаваным пераліку нагод. Літва таксама ад пачатку сакавіка не выдае візы большасці беларускіх грамадзян. «І ў гэтай сітуацыі Беларусь дазваляе прыязджаць увогуле без візы, ды яшчэ і неабмежаваную колькасць разоў. Так, пакуль гэта толькі да 15 мая, але ўсё ж Мінск такім чынам уцерла нос Вільнюсу і Рызе ва ўмоўным спаборніцтве па гуманнасці адносін да жыхароў суседніх краін», — піша Baltnews.

У суседніх краінах на гэтай глебе, відаць, абвастрылася запозненая веснавая параноя. Так, у Міністэрстве замежных спраў Латвіі адзначылі, што ўезд у Беларусь звязаны са значнымі рызыкамі. Па-ранейшаму застаецца ў сіле заклік да жыхароў Латвіі пакінуць як Беларусь, так і Расію. «Нельга выключыць і правакацыі супраць людзей, якія сапраўды, магчыма, паехалі наведаць кагосьці з родных ці адправіліся ў турыстычную паездку. Чалавек можа нешта сфатаграфаваць і раптоўна быць абвешчаным шпіёнам НАТА», — прывёў у эфіры LTV прыклад магчымага непрыемнага сцэнарыя міністр замежных спраў Латвіі Эдгар Рынкевіч.

Як заўважыў навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў усходнееўрапейскай палітыкі Марцыс Баладзіс, нават кароткачасовая адмена віз прыкметна павялічвае паток прыезджых, што дае магчымасці спецслужбам Беларусі і Расіі разгарнуць разведку, завербаваць замежных грамадзян і дзейнічаць супраць інтарэсаў Латвіі. Як вам «закідон»? Па-мойму, клінічны выпадак, не інакш.

Відавочна, што паездкі свайх грамадзян у нашу краіну Рыга спрабуе абмежаваць шляхам фэйкаў. Латышам, якія перасякаюць беларускую граніцу, выдаюць змайстраваныя памяткі на трох мовах. У прывятнасці, у іх гаворыцца, што набываць паліва ў Беларусі нібыта забаронена.

Grani.lv па просьбах чытачоў высвятлялі, ці не самаўпраўнасць гэта мытнай службы і як кантралюецца выкананне дадзенага закона. На КПП «Патэрнеікі» пацвердзілі, што ўвозіць у Латвію нельга ні літра — ні бензіну, ні дызпаліва, ні іншых нафтапрадуктаў. Праўда, сакрэтамі кантролю за аўтамабільнымі бакамі латвійскіх кіроўцаў не падзяліліся. Параілі звярнуцца для гэтага ў Рыгу. У Мытным упраўленні сталіцы пытанне кантролю бакаў таксама абышлі бокам. Але распавялі, што, у адпаведнасці з артыкулам 1 Савета Рэгламента ЕС ад 24 чэрвеня мінулага года (дакумента, які каардынуе санкцыі, уведзеныя супраць РБ), набыццё нафтапрадуктаў у Беларусі для асабістага карыстання забаронена. Журналісты grani.lv пацікавіліся: калі купляць нафтапрадукты ў Беларусі забаронена яшчэ з сярэдзіны 2021-га, то чаму кіроўцам на граніцы пачалі выдаваць спецыяльныя памяткі пра гэта толькі зараз? Выразнага адказу на сваё пытанне нашы латвійскія калегі не атрымалі, затое ім параілі запасацца гаручым на радзіме. Ну, а калі паліва, набытае на латвійскай запраўцы, у Беларусі скончылася, цікавяцца жыхары Латвіі. Машыну да граніцы давядзецца штурхаць? Пытанне застаецца рытарычным, заўважылі grani.lv.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы на Вялікдзень храм Праабражэння Гасподняга ў гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна, заклікаў суседняя краіны берагчы мір і жыць дружна. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў гэты дзень у Бога просяць галоўнае. А галоўнае — гэта мір, згода, дружба, якія заўсёды былі ўласцівыя беларусам. І гэта сёння вельмі актуальна, падкрэсліў Прэзідэнт.

У імя міру, нармальнага жыцця і дружбы кіраўнік дзяржавы звярнуўся да суседзяў Беларусі: «Давайце жыць дружна. Хацеў бы папрасіць сваіх калег-палітыкаў: давайце не будзем ствараць нашым людзям праблем, іх і цяпер хапае. Вы паглядзіце, што адбываецца з суседнімі Літвой і Латвіяй, палякамі. Я пра Украіну ў гэтым выпадку ўжо не кажу. Яны ж былі такія шчаслівыя, вясёлыя. Жылі ў «заможным» свеце, у іх усё было. І дзе яны сёння? Яны стаяць уздоўж граніцы і просяць нас, каб мы іх прапусцілі ў Беларусь. Хоць бы грэцкіх круп купіць. Хай сабе круп — солі няма, солі просяць у нас».

«Мы, як высакародныя людзі, адкрываем гэту граніцу, і асабліва напярэдадні рэлігійных свят: прыходзьце, тут вашы людзі. Граніца не павінна перашкаджаць нармальнаму жыццю, і нашым суседзям у тым ліку. Мы заўсёды ставімся да людзей па-суседску, па-чалавечы, па-людску, як у нас кажуць. І адзінае хачу: каб такое было стаўленне і да нас», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

І простыя людзі па той бок граніцы ветлівае запрашэнне кіраўніка беларускай дзяржавы пачулі і ацанілі належным чынам. Як паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце, за першы тыдзень бязвізу ў Беларусь прыбыло каля чатырох тысяч чалавек. Насуперак усім фэйкам і ўладнай параноі.

Пётр ДУНЬКО.

Каментарый у тэму

Прыбалтыка будуе новую сцяну ў Еўропе, заявіў БелТА **палітолаг, эксперт грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Пётр ПЯТРОЎСКІ**.

«Прыбалтыка абмежавала на сённяшні дзень магчымасць уезду ў Рэспубліку Беларусь уласных грамадзян у плане тых наяўных сум, з якімі яны могуць уязджаць, — не больш за 60 еўра. Гэта пра што гаворыць? Па-першае, пра тое, што прыбалтыйскія краіны баяцца канкурэнцыі беларускай прадукцыі і трансгранічнага гандлю. Па-другое, краіны дэманструюць агрэсіўную антыбеларускую палітыку ў плане эканамічных санкцый і стварэння штучных бар'ераў, — адзначыў Пётр Пятроўскі. — Трэці момант — цана на беларускае паліва паказвае, наколькі больш канкурэнтаздольная беларуская мадэль развіцця. Прыбалтыка выбрала канфрантацыю з Расіяй, эканамічную вайну. Мы можам прагназаваць, што Прыбалтыка адмовіцца ад аплаты, напрыклад, газу і нафты ў расійскіх рублях, і гэта ўсё вядзе да энергетычнага калапсу».

Палітолаг падкрэсліў: прыбалтыйскія краіны баяцца канкурэнцыі. «Таго, што беларускія энерганосьбіты, беларускае паліва апынецца на прыбалтыйскіх рынках і замясціць сабой тыя кампаніі, якія сёння ўжо з'яўляюцца ахвярамі вось гэтых абмежаванняў, гэтых эмбарга і санкцый краін Прыбалтыкі, — адзначыў ён. — Таму тут Беларусь не павінна мець ілюзій. Яны будуюць еўрапейскую сцяну накшталт берлінскай. Гэтая сцяна мае сваю асаблівасць. Яна эканамічная. І акрамя агрэсіі і парушэння правоў уласных грамадзян, ад Прыбалтыкі нічога чакаць не варта».

ЖКГ-СТРЫМЫ І АНЛАЙН-КАНСУЛЬТАЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

За апошнія чатыры гады капітальна адрамантавана 137 прыдомавых тэрыторый, на сёлета запланавана яшчэ 14. Падчас такога капрамонту выконваюцца ўсе віды работ па добраўпарадкаванні. Летась у дварах Мінска, дарэчы, пасадзілі 15 тысяч дрэў і звыш 42 тысяч кустоў. У план бягучага рамонту сёлета ўключаны 3624 пад'езды, з якіх за зіму 421 ужо адрамантавалі. Запланаваны рамонт 463 кантэйнерных пляцовак. Мяркуецца закрыць 368 смеццеправодаў у жылых дамах (з 2016-га па жаданні і згодзе ўласнікаў закансервавана ўжо 3847 смеццеправодаў).

— Энергаэфектыўныя мерапрыемствы вядуцца цяпер на трох сталічных дамах: Каліноўскага, 26 (амаль гатовы), К. Чорнага, 4 і Піянерская, 4. Палову кошту ўцяплення фасаду на Каліноўскага на працягу дзесяці гадоў будуць аплачваць жыхары. Для двухпакаёўкі памерам 50 м² «камуналка» пры гэтым павялічыцца прыкладна на восем рублёў за месяц, — паведаміў спецыяліст.

ШКОЛА ЖКГ, ЧАТ-БОТ І БУКЛЕТЫ З QR-КОДАМІ

У Заводскім і Кастрычніцкім раёнах завяршаецца ўкараненне праграмнага прадукту «Дзяржаўная інфармацыйная сістэма ЖКГ», якая будзе аб'ядноўваць у сабе абсалютна ўсю інфармацыю па жылым доме. А плацельшчыкі ЖКП могуць зарэгістравацца на сайце адзінага разлікова-даведачнага цэнтра Мінска, каб атрымліваць электронныя паведамленні і адсочваць статус прынятых рашэнняў па сваіх заявах у рэжыме рэальнага часу, агучыў дасягненні ў рабоце камунальнікаў Андрэй Новік:

— Арганізацыі ЖКГ будуць практыкаваць і сучасныя формы стасункаў з людзьмі: ЖКГ-стрымы, анлайн-кансультацыі, новыя рубрыкі ў тэлеграм-канале (гісторыя ЖКГ, судовая практыка, работа з даўжнікамі і іншыя), анлайн-апытанні, распаўсюджванне буклетаў з QR-кодамі, рэалізацыя праекта «Школа ЖКГ для школьнікаў». Сумесна з Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама плануем актуалізаваць дзейнасць чат-боту «Мая рэспубліка» 115.бел» у тэлеграм-канале.



Праз яго камунальнікі намерваюцца адказваць на самыя актуальныя пытанні спажыўцоў: пра нумары і адрасы арганізацый, рэжым працы, перыядычнасць прыборкі, замены індывідуальных прылад уліку.

ПАДАМАВЫ ЎЛІК ЗАТРАТ І СЛУЖБА 115

Служба 115 і праграма «Дзяржаўная інфармацыйная сістэма ЖКГ» — распрацоўкі Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама, які займаецца лічбавізацыяй галіны гарадскіх камунальных прадпрыемстваў.

Сёння служба 115 акумулюе ўсе скаргі, пажаданні, просьбы і заявы жыхароў. І з 2018 года колькасць прэтэнзій на неаказанне ЖКП змяншаецца штогод мінімум на 1,5 %. А першы модуль праграмы — падамавы ўлік затрат — быў паспяхова апрабаваны ў Заводскім раёне сталіцы. Сёлета такі падыход хочуць рэалізаваць ва ўсіх сталічных раёнах, заўважыў **Максім БАРДОВІЧ, дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама**:

— Усе работы па доме павінны выконвацца адпаведна з тэхналагічнымі картамі і рэгламентамі. Існуе дакладная паслядоўнасць, дзе, калі і якую работу павінен зрабіць майстар па доме, дакладная фіксацыя гэтага. У выніку мы атрымліваем дакладную калькуляцыю работ па будынку — тое, што прапісваецца ў жыроўцы як тэхнічнае абслугоўванне. Мы павінны разумець, з чаго яно складаецца і што на гэта затраціла прадпрыемства па абслугоўванні пэўнага дома. Гэтыя звесткі патрэбны і нашым гарадскім арганізацыям, і жыхарам, якіх, пэўна ж, зацікавяць віды работ у іх доме.

Другі напрамак дзейнасці праграмы — інвентарызацыя ўсяго жылфонду і малых архітэктурных формаў, каб камунальнікі разумелі, дзе, калі і што яны павінны зрабіць. У далейшым інфармацыйную сістэму ЖКГ інтэгруюць са службай 115, каб жыхары маглі ў рэжыме анлайн атрымаць любую інфармацыю па доме. Карыстаюцца інтэрнэт-сэрвісамі, дарэчы, людзі да 35 гадоў, больш сталыя аддаюць перавагу тэлефонным званкам, расказаў дырэктар цэнтра:

— Мы актыўна працуем з Казахстанам. Калі шэсць гадоў таму стварылася служба 115, то ідэю работы і атрымання зваротнай сувязі з жыхарамі праз мабільны дадатак мы падглядзелі ў Расіі, аднак рабілі яе з улікам існуючых у Беларусі рэалій. Прынцып работы гарадской гаспадаркі ў нас прыкладна такі ж, як і ў Расіі. Працэсы практычна аднолькавыя, але са сваёй спецыфікай, таму можна аналізаваць, як гэта рэалізавана ў суседзяў, і адаптаваць пад беларускія ўмовы.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Да Дня беларускага пісьменства

ДОБРУШ ЯК КРОПКА ПРЫЦЯГНЕННЯ

У час святкавання Дня беларускага пісьменства Добруш павінен стаць кропкай прыцягнення турыстаў. Аб гэтым сказаў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства, перадае карэспандэнт БелТА.

«Добруш — горад невялікі, і для яго жыхароў, гасцей гэты дзень стане знакавай падзеяй. Наша задача зрабіць яго пасапраўднаму запамінальным. Для гэтага трэба максімальна выкарыстаць не толькі напрацаваны намі вопыт мінулых гадоў, але і ўнесці новыя фарбы ў святочнае мерапрыемства», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Паводле яго слоў, Дзень беларускага пісьменства пройдзе пад знакам Года гістарычнай памяці. «Таму мы павінны не проста гаварыць пра літаратуру, багацце беларускай мовы і традыцый нашага народа. Праз мерапрыемствы свята неабходна правесці асноўныя ідэі Года гістарычнай памяці», — звярнуў увагу віцэ-прэм'ер.

У ходзе пасяджэння разглядаліся пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай канцэпцыі праграмы свята, з падыходамі да правядзення цырымоніі адкрыцця і закрыцця Дня пісьменства і святочных мерапрыемстваў у цэлым. Таксама ўдзельнікі абмеркавалі, як вырашаюцца пытанні з фінансаваннем гэтых мерапрыемстваў, як будзе арганізавана інфармацыйная падтрымка Дня пісьменства.

«Неабходна таксама загадзя прадумаць пытанні прыцягнення турыстаў. Добруш павінен стаць для іх у святочныя дні кропкай прыцягнення. Міністэрству спорту і турызму сумесна з абласным выканаўчым камітэтам неабходна арганізаваць работу па падрыхтоўцы адпаведных турыстычных маршрутаў або іх удакладненні. Акрамя таго, трэба прадумаць, якія спартыўныя мерапрыемствы могуць быць арганізаваны ў рамках Дня пісьменства», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Акрамя гэтага, на пасяджэнні абмяркоўвалася, якія мерапрыемствы плануецца арганізаваць для дзяцей і моладзі. «Усім арганізатарам трэба прыкласці максімум намаганняў для таго, каб прыцягнуць да ўдзелу ў свяце як мага больш моладзі. Актыўная роля павінна быць выканана БРСМ і БРПА ў частцы прыцягнення і арганізацыі цікавых пляцовак у рамках святкавання Дня пісьменства для дзяцей і моладзі», — паведаміў віцэ-прэм'ер.

Паводле слоў Ігара Петрышэнкі, пры падрыхтоўцы да Дня пісьменства заўсёды асаблівая ўвага ўдзяляецца добраўпарадкаванню і прывядзенню ў парадак горада, дзе праводзіцца свята. Таму на пасяджэнні будуць закрануты пытанні, звязаныя з правядзеннем работ па рамонце, рэканструкцыі і абнаўленні гарадскіх аб'ектаў, а таксама з арганізацыяй размяшчэння і харчавання ўдзельнікаў і гасцей свята.

Надвор'е

ЗА АКНОМ СОНЕЧНА, АЛЕ НА ДВАРЭ ПАЎНОЧНЫ ВЕЦЕР...

Май на носе, а сапраўднага цяпла мы сёлета так і не бачылі. І апошнія дні красавіка не прынясуць нам вясновага камфорту, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У канцы тыдня дыскамфорт прынясе халодны паўночны, паўночна-заходні вецер. У начныя гадзіны месцамі будуць адзначацца адмоўныя тэмпературы, а ў разгар дня паветра прагрэецца да плюс 10—16 градусаў. Аднак такі тэмпературны рэжым на 1—6 градусаў адстае ад неабходнага па календары.

У суботу чакаюцца замаразкі. Уначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 4, па паўднёвым захадзе да 6 цяпла. Удзень будзе 9—16 градусаў вышэй за нуль.

Як адзначаюць сіноптыкі, у пачатку мая будзе захоўвацца вясновая няўстойлівасць у характары надвор'я, ды і сапраўднага майскага цяпла нам яшчэ прыйдзецца пачакаць.

У першы дзень мая, у нядзелю, уначы будзе пераважна без ападкаў, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, па паўднёвым захадзе да плюс 7 градусаў. Удзень будзе ад 10 цяпла па поўначы да 18 градусаў вышэй за нуль па паўднёвым захадзе краіны.

У панядзелак месцамі ў нашым рэгіёне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў. Удзень будзе 12—19 цяпла.

На свята 3 мая надвор'е таксама не дасць паслабіцца. У гэты час уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 2—9 градусаў. Удзень будзе ад плюс 12 градусаў па паўночным захадзе да 19 цяпла па паўднёвым усходзе краіны. Чакаем цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Захарава паведаміла, што Захад у адкрытую заклікаў Кіеў атакаваць РФ прадастаўленым узбраеннем

Афіцыйны прадстаўнік расійскага МЗС Марыя Захарава заявіла, што краіны Захаду адкрыта заклікалі Украіну да нападзення на тэрыторыю Расіі з ужываннем зброі, якая пастаўляецца Кіеву. Пра гэта паведамляе ТАСС.

«Мы ўжо каментавалі днямі заявы намесніка міністра абароны Вялікабрытаніі Джэймса Хіпі аб дапушчальнасці нанясення Украінай удараў па ваенных цэлях на тэрыторыі Расіі», — падкрэсліла Захарава. Паводле яе слоў, Захад заклікаў Кіеў атакаваць Расію. Пры гэтым у Кіеве, як дадала Захарава, словы краін Захаду ўспрынялі як інструкцыю да дзеяння.

Падобнага плана актыўнасць Узброеных Сіл Украіны супраць тэрыторыі Расіі не можа застацца без адказу, адзначыла дыпламат.

Раней стала вядома, што ў Мінабароны Брытаніі палічылі «законным» нанясенне УСУ удараў па ваенных аб'ектах Расіі.

Генеральны сакратар НАТА паабяцаў Швецыі і Фінляндыі хуткае ўступленне ў альянс

Енс Столтэнберг лічыць, што працэс уступлення Швецыі і Фінляндыі ў альянс будзе хуткім. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».

Паводле яго слоў, згаданыя краіны самі павінны прыняць рашэнне, запытваць членства ў НАТА ці не, і калі яны захочуць уступіць у альянс, то будуць прыняты «з вялікай радасцю».

«Швецыя і Фінляндыя — нашы найбольш блізкія партнёры, мы працуем з імі многія гады, іх Узброеныя Сілы адпавядаюць стандартам НАТА... Я чакаю, што працэс далучэння будзе хуткім», — сказаў Столтэнберг. Ён дадаў, што НАТА знойдзе спосаб гарантаваць бяспеку дзвюм краінам у пераходны перыяд паміж падачай запытаў і афіцыйнай ратыфікацыяй. Раней выданне Iltalehti паведаміла, што Фінляндыя і Швецыя пададуць заяўку на членства ў НАТА ў перыяд з 16 да 20 мая.

Хельсінкі і Стакгольм загаварылі аб магчымасці ўступлення ў НАТА і адмовы ад шматгадовага нейтралітэту на фоне расійскай ваеннай аперацыі ва Украіне.

Эмануэля Макрона абаранілі ад атакі памідорамі парасонам за 9,5 тысячы еўра

Парасон, якім прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона абаранілі ад памідораў, што паляцелі ў яго падчас прагулкі па рынку, быў выраблены фірмай Kevlar і каштуе прыкладна 9,5 тысячы еўра. Пра гэта паведамляе Daily Telegraph.

Адзначаецца, што гэта парасон спецыяльнага прызначэння пад назвай pararactum — ён вытрымлівае не толькі «атакі» памідораў, але і ўдары нажом або ўкусы сабак. Акрамя таго, яго тэсціравалі на здольнасць вытрымліваць кіслату.

На відэа, знятым 27 красавіка на рынку ў Сержы — (гэта паўночна-заходні прыгарад Парыжа), можна ўбачыць, як падчас прагулкі на адбранага на другі тэрмін прэзідэнта ляціць упакоўка памідораў чэры. Праляцеўшы над галавой Макрона, таматы прызямляюцца на плечы і галовы мужчын, якія стаяць за спіной французскага лідара. Пасля целаахоўнікі Макрона пачынаюць закрываць яго галаву рукамі, а над яго галавой расчыняецца парасон са зламанай спіцай.

Ад Вогненнай дугі да Перамогі

У сераду, 4 мая, на «Беларусь 3» распачынаецца паказ гераічнай кінаэпапеі «Вызваленне» рэжысёра Юрыя Озерава. Вялікае кінапалатно падзей Вялікай Айчыннай вайны, якое складаецца з пяці фільмаў, дзе расказваецца пра больш чым паўсотню рэальных гістарычных персанажаў.

Першы фільм «Вогненная дуга» распавядае аб грандыёзнай бітве на Курскай дузе летам 1943 года. Там адбылася самая вялікая ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны танкавая бітва. Кінастужка паказвае не толькі лёсы герояў, але і маштабы таго, як змагаліся людзі ў тых умовах на фронце і ў тыле.

Дзеянне другога фільма «Прарыў» ахоплівае час з лета да канца 1943 года. Пасля перамогі Чырвонай Арміі на Курскай дузе змяняюцца суадносіны сіл у Еўропе...

Фільм трэці мае назву «Напрамак галоўнага ўдару» і прысвечаны аперацыі «Баграціён», у ходзе якой была поўнасцю вызвалена Беларусь. А вось кінастужкі «Бітва за Берлін» (1971) і «Апошні штурм» (1971) — гэта аповеды пра падзеі апошніх месяцаў і дзён вайны. Тут вырашаецца лёс Берліна на палях змагання, гучаць пераможныя залпы і героі сустракаюцца ў фінале, дзе дабро бярэ верх над злом.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 164

Адкрыты чэмпіянат Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын — інвалідаў па зроку прайшоў з 15 па 18 красавіка.

У мужчынскім турніры па швейцарскай сістэме ў сем тураў пры 14 удзельніках перамог майстар спорту Віктар Чыж, які прадстаўляе Гродна. На другім месцы майстар спорту міжнароднага класа Дзмітрый Фадзееў, трэцім фінішаваў майстар спорту Уладзімір Бяляеўскі (абодва — Мінск). У жанчын турнір прайшоў па кругавой сістэме пры 7 удзельніцах. Чэмпіёнкай стала Ірына Чарзднічэнка (Мінск). На другім месцы — Валянціна Хаданёнак (Магілёў), бронзавы медаль у Зінаіды Дземідзенкі (Гомель).

Цікавая барацьба разгарнулася ў партыі майстроў.

№ 53

№ 53 У. Бяляеўскі — В. Чыж

Белыя простыя: c1, h2, e3, d4, f4, h4 (6).
Чорныя простыя: a3, b6, d6, f6, h6, f8 (6).

Белыя пайшлі ў атаку 1. h4-g5 f6:h4 2. d4-e5 d6-c5 3. e5-f6, аднак чорныя знайшлі контргульню з ахвярай дзвюх шашак у адказ h4-g3! 4. f4-e5 g3-f2 5. e3:g1 h6-g5! 6. f6:h4 c5-b4 7. g1-f2 b4-c3 8. f2-e3 b6-c5? Выпускае выйгрыш, перамога была магчыма пасля (8...c3-b2!) Цяпер ахвяраваць наступіла чарга белых.

9. h2-g3! c3-b2 10. e3-d4 c5:e3 11. g3-f4 e3:g5 12. h4:f6=.

Дзве наступныя кампазіцыі склаў Р. Валееў (Расія).

№ 54

Белыя простыя: b2, d2, g3, e5, h6 (5).
Чорныя простыя: a3, c5, a7, e7 (4).

№ 55

Белыя простыя: a1, g1, c3, d4, a5, c5, b6 (7).
Чорныя простыя: b2, f4, h4, e5, f6, h6, d8 (7).

Наступныя кампазіцыі складзеныя вядучым аддзела (№№ 58 і 59 — па правілах бразільскіх шашак).

№ 56

Белыя простыя: h2, c5, e5, e7 (4).
Чорныя простыя: e3, g3, f4, a7, c7, g7 (6).

№ 57

Белыя простыя: h2, c5, e5, e7 (4).
Чорныя простыя: e3, g3, f4, c7, g7, b8 (6).

№ 58

Белыя простыя: a1, g1, a5, c5, b6, d6, e7 (7).
Чорныя простыя: b2, c3, e3, a7, b8, d8, f8 (7).

№ 59

Белыя простыя: a1, c3, b4, d4, h4, c5, d6 (7).
Чорныя простыя: a3, f4, f6, h6, a7, g7, b8, f8 (8).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 163 ад 15.04.22.

№ 46 1. gf6 g:e5 2. hg7 f:h6 3. hg5 d:f8 4. f:b8 h2:d2 5. b:d6 h:f4 6. fe3 d:f2 7. de7 f:d6 8. b:c3+.

№ 47 1. cd6 a:e7 2. fe5 d:b6 3. f:h4 e:c5 4. ed6 c:e7 5. gf6 e:g5 6. h:a1+.

№ 49 1. c1-d2 a3:g5 2. g3-f4 a5:g3 3. h2:b8+.

№ 50 1. c5-d6 e5:c3 2. e1-d2 c3:g3 3. h2:d6+ С. Бурко указвае ПР: 1. b4-a5 g7-f6 2. b6-a7 e7-d6 3. c5:e7 f6xd8 4. a7-b8 e5-d4 5. a5-b6 g5- f6 6. b8-e5! f6-h8 7. e5:a1 d8-e7 8. b6-a7 e7-f6 9. a1:g7 h8:g1 10. a7-b8 g1- d4 11. e1-f2! d4:g1 12. b8-a7 x.

№ 51 1. 24-20 13:15 2. 37-32 27:29 3. 44-39 22:44 4. 50:30 26:37 5. 45:03 35:24 6. 03:20 15:24 7. 49-43+.

№ 52 1. 37-31 36:29 2. 44-39 22:44 3. 50:30 35:24 (калі: 3...26:37 то: 4. 45:3 35:24 5. 3:20 15:24 6. 49-44 24-29 7. 44-39 x.) 4. 45:3 26:37 5. 3:20 15:24 6. 49-44 24-29 7. 44-39 x.

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), А і А. Высоцкія (г. Копыль), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

МАСТАЦТВА, ШТО НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ І ДАЕ ВЕРУ

Музыка і танец — спадарожнікі чалавека спакон вякоў. Яны здольныя дапамагчы ў выказванні думак, пачуццяў, настрою, а таксама аб'яднаць і натхніць кожнага. І сёння, і заўтра ва ўсім свеце будуць святочна згадваць гэтыя два віды мастацтва. Міжнародны дзень танца як свята ЮНЕСКА ініцыявала яшчэ ў 1982 годзе. Прычым дату — 29 красавіка — выбралі невыпадкова, а ў памяць аб дні нараджэння французскага балетмайстра, рэфарматара балета Жан-Жоржы Наверы. На сацыякультурным тэлеканале гэты дзень сярод іншага адзначаць прэм'ерай. У вячэрнім эфіры тут пакажуць балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета «Канёк-гарбунок».



Створаны па матывах аднайменнай класічнай казкі П. Яршова, знаёмай амаль што кожнаму з дзяцінства, спектакль сумяшчае харство сучаснай харэаграфіі і яскравасць чарадзейных фальклорных вобразаў і таму зацікаўлівае тэатралаў усіх узростаў. Гэта адна з самых ранніх работ Шчадрына (на той момант кампазітару было крыху больш за 20 гадоў). Балет быў напісаны ў 1955-м ці ў 1958-м (на гэты конт меркаванні разыходзяцца) па заказе Вялікага тэатра. І мог бы твор, можа, і не ўбачыць свет, калі б не Беларусь. Як успамінаў сам кампазітар, натхніла яго паездка ў беларускую глуш, дзе ў атачэнні прыроды і далёка ад цывілізацыі ён слухаў народныя песні. І пасля гэты балет стаў сапраўды важным творам у жыцці маэстра. Партытуру Шчадрын прысвяціў Маі Плісецкай, якая стала яго жонкай. А пазнаёмілася пара якраз на рэпетыцыях «Канька-Гарбунка». І пасля кампазітар распавядаў: «Музыка да балета «Канёк-Гарбунок» — мая ранняя, вельмі ранняя праца. Але праца этапная, важная для майго творчага самасцвярджэння і якая многае ў маім жыцці вызначыла». Дзякуючы гэтай пастаноўцы, яму і ўдалося злавіць сваю незямную Жар-птушку. У розныя перыяды і ў розных тэатрах балет ставілі Аляксандр Радунскі, Ігар Бельскі, Дзмітрый Брынцаў, Ніна Анісімава і іншыя. Захаваўся нават фільм-балет «Казка пра Канька-Гарбунка» — гэта спектакль Вялікага тэатра з удзелам легендарных Маі Плісецкай і Уладзіміра Васільева.

У Вялікім тэатры Беларусі балет «Канёк-Гарбунок» упершыню паказалі восенню мінулага года. Тады пастановачная група на чале з народным артыстам Беларусі Юрыем Траянам прадставіла публіцы сваё бачанне знакамітага твора. Як пазней адзначаў Юрый Антонавіч у інтэрв'ю, галоўнай мэтай стала імкненне зберагчы атмасферу і дух рускай народнай казкі. Тут, па задумцы стваральнікаў, галоўнага героя чакае шэраг выпрабаванняў, якія ён павінен пераадолець як сярод людзей, так і ў казачным свеце.

